Статистические данные показывают, что о существовании статьи знает 100% студентов, в то время как лонгрид знаком лишь для 50% опрошенных. Это свидетельствует о том, что жанровый формат лонгрида, сформировавшийся в англоязычных медиа, проникает в наше медиапространство, постепенно набирая популярность. Таким образом, лонгрид, обладая особенностями организации сюжета, предстает неким переходным звеном между классической статьей и новеллой по содержательности и постановке проблемы.


1. «Banquets Are Back in Fashion. But Where Does All the Food Go?». [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.nytimes.com/2020/02/21/t-magazine/fashion-banquet-food-waste.html?action=click&module=Features&pgtype=Homepage. - Дата доступа: 03.03.2020 – 04.03.2020
2. «Golden Dawn: the rise and fall of Greece’s neo-Nazis». [Электронный ресурс].Режим доступа: https://www.theguardian.com/news/2020/mar/03/golden-dawn-the-rise-and-fall-of-greece-neo-nazi-trial. - Дата доступа: 03.03.2020 – 04.03.2020.
3. «The database that means festivals have 'no excuses' on gender balance». [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.bbc.com/news/entertainment-arts-51723513. - Дата доступа: 03.03.2020 – 04.03.2020.
4. «The Ghost Hunter». [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://magazine.atavist.com/the-ghost-hunter-galleon-shipwreck-oregon-goonies-philippines. - Режим доступа: 29.02.2020 – 04.03.2020.


## ТЭМА ПАМЯЦІ ПРОДКАЎ І ЗАХАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙ У ТВОРЫ “РАДЗІВА “ПРУДОК”. ДЗЁННІК” А. ГОРВАТА


***Селязень К.Я.,***
*студэнтка 1 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт


Прозвішча Андруся Горвата ўвайшло ў беларускую літаратуру нядаўна. Дзякуючы публікацыям свайго вясковага жыцця ў сацыяльнай сетцы Facebook, ён набыў прыхільнікаў яшчэ да выхаду папулярнай у сучаснай культурнай прасторы кнігі “Радзіва “Прудок”. Дзённік”.

Мэта артыкула – вызначыць ідэйна-мастацкія адметнасці шматграннага ўвасаблення канцэптуальнай тэмы сувязі з роднымі першавытокамі ў творы Горвата “Радзіва “Прудок”. Дзённік”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле з’яўляецца твор “Радзіва “Прудок”. Дзённік” А. Горвата. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага і дэскрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Сам аўтар, як і пратаганіст у “Радзіва…”, з’яўляўся ў мінулым выпускніком факультэта журналістыкі БДУ, пасля быў вымушаны працаваць два гады дворнікам Купалаўскага тэатра, падзарабляць у жаночым манастыры. Відавочна, што тут ніякай сур’ёзнай працы, а тым больш кар’ернага росту. Кампенсацыяй мінімальнай культурна-эстэтычнай прасторы становіцца ўнутраны свет героя, плынь яго разваг і адчуванняў, адлюстраваныя ў згаданай кнізе.

Той факт, што сталічнага жыхара ўвесь час цягне на малую радзіму, адкрыта адлюстраваны ў тэксце: “Скончыцца зіма, і я пераеду жыць у сваю хату. Таму я люблю прыбіраць снег: гэта як чысціць доўгую дарогу дадому” [1, с.12]. Нават дробязная фізічная праца па-філасофску глыбока асэнсоўваецца персанажам, калі гэта хоць асацыятыўна звязана з радзімай.

У жанрава-кампазіцыйным плане твор прэзентуецца як дзённік, аб чым відавочна сведчыць нават яго назва. У лаканічных запісах першага раздзела вельмі часта згадваецца вёска Прудок або само Палессе. Пры ўсёй лёгкасці і моўнай нязмушанасці мастацкага аповеду ў творы тут канстантна праяўляецца глыбокая патрыятычная скіраванасць пазіцыі наратара. Яскравым прыкладам можа служыць тое, што аднойчы галоўны герой просіць маці перадаць яму паўкіло палескай зямлі: “Калі я хачу дадому, я высыпаю зямлю на газетку і станаўлюся на яе басанож. Заплюшчваю вочы і чую Прыпяць” [1, с.14]. Гэта дапамагае герою ўяўна апынуцца ў роднай вёсцы, згадаць дзяцінства, насычае яго душэўнай моцай.

У ходзе сюжэтнага развіцця бачна, што галоўны герой не баіцца змяняць сваё жыццё, ісці да невядомага. У яго складваецца пэўны план будучыні, які варта рэалізаваць. Андрусь не толькі гатовы кінуць амаль бесклапотнае сталічнае жыццё, ён літаральна лічыць секунды да таго моманту, калі вернецца ў былую хату: “Праз адзін мільён васемсот чатырнаццаць тысяч чатырыста секунд я буду дома” [1, с.27]. І ў гэтым праяўляецца яшчэ адна адметнасць характару галоўнага героя: адчуванне роднай сувязі з вёскай. Горват не без іроніі разважае адносна ўласнага выбару: “Дом – гэта тэрыторыя, якую я магу змяніць. У мяне ёсць паўгектара, абнесеныя плотам, і ўнутры гэтага плота я магу рабіць усё, што хачу. Ну, умоўна кажучы. Гэта і ёсць дом – магчымасць там будаваць сваё. У кватэры што: шпалеры пераклеіць, шафу перасунуць – магчымасцяў менш” [1, с.28].

Знаходзячыся ў вясковай хаце, Андрусь успамінае свайго дзеда, тымчасовыя пабудовы і рэчы. Такім чынам персанаж здзяйсняе пэўную генеалагічную верыфікацыю, мадэляванне магчымага лёсу сям’і. Гэтая ж сітуацыя развіваецца і ў рэальнасці, калі бацькі, цёткі, дзядзькі, мясцовыя жыхары і іншыя выпадковыя людзі знаёмяць галоўнага героя з “тутэйшым” жыццём, традыцыямі і гісторыяй продкаў.

Андрусь з вялікай цікавасцю слухае і запамінае ўсё тое, пра што распавядаюць яму старыя людзі. Ён па-сапраўднаму разумее каштоўнасць усяго створанага народам, іх укладу і поглядаў. Герой хоча да драбніц захаваць гэта ў памяці: “Я з замілаваннем слухаю яе мову. Етака, чагойліся, кажны, лісянкі,

Репозиторий ВГУ

роскідуйся, куплеюць…” [1, с.20]. Некаторыя дыялектныя словы нават прымусілі Андруся правесці апытанне сярод мясцовага насельніцтва, каб зразумець іх сэнс: “Эй вы там, у Мінску, сядайце за стол і перапісвайце слоўнікі! Мы тут учора правялі інтэрактыўную нараду па слове “анігадкі” і гуртам уразумелі, што слоўнікавае тлумачэнне *ані* – гадкі, прысл., разм. Хоць бы што – нават прудкаўскія куры засмяюць… У большасці выпадкаў, як заўважыла першая хваля аўцюкоўскіх перасяленцаў, “анігадкі” лёгка замяняецца на “гэта ж трэба!”… На Мазыршчане – “нягадкі” [1, с.82].

Аўтэнтычныя традыцыі таксама не абмінулі Горвата. Яму давялося асабіста даведацца і аб дзіўных завядзёнках мясцовасці: “Такое правіла было: калі ідзеш красці – кум ты мне, брат ці які яшчэ чорт, але я не бачыў цябе, ты не бачыў мяне. А сёння ў нейкай прудкаўской хаце ядуць крадзеную Шурыкаву бульбу. Не ўмірае палеская традыцыя!” [1, с.67]. Як бачна, аўтарскае апісанне падзей грунтуецца на натуральнай цікаўнасці персанажа, яго павазе і адначаснай камічнасці. Пазнаёміўся герой не толькі з жартаўлівымі традыцыямі, але і з агульнапрынятымі, “сур'ёзнымі” святамі (Вялікдзень, Радаўніца, Дзяды, іншыя) і іх асаблівасцямі ў дадзенай мясцовасці.

Сам твор утрымлівае вельмі шмат звестак з сямейнай біяграфіі Горвата. Так, асобныя раздзелы прысвечаны, напрыклад, гісторыі старой Ганны. Гэтыя часткі яшчэ больш падкрэсліваюць неабыякавасць Андруся да свайго мінулага: “Чужых дзяцей не бывае – няма і чужых магіл. Яны розныя, як прудкаўскія хаткі: каменныя і драўляныя, абнесеныя плотам і згубленыя ў хмызняку. Драўляныя крыжыкі без агароджаў, пад імі пахаваныя не людзі, а памяць пра іх… Вяртаюся той самай даўгой вуліцай дадому і думаю, што з кожным крокам прудкаўскія могілкі ўсё далей і далей ззаду. Папраўдзе ж яны ўсё бліжэй і бліжэй наперадзе. Пакуль я дакрочу, у мяне, мабыць, ёсць час дабудаваць хату, вырасціць сад і расказаць унукам пра космас” [1, с.144]. Бачна, што Андрусь сапраўды імкнецца быць як мага бліжэй да продкаў, не хоча адыходзіць ад справечных ідэалаў і каштоўнасцей.

**Заключэнне.** Такім чынам, можна прыйсці да высновы, што ў кантэксце кнігі галоўны герой з'яўляецца тым ідэйна-мастацкім звяном, што знітоўвае мінулыя пакаленні з сучаснымі. Ён – носьбіт памяці аб нашых продках і іх традыцыях. Пры гэтым мастацкае раскрыццё патрыятычнай пазіцыі пратаганіста адбываецца нязмушана, без залішняга пафасу, натуральна і з іроніяй.

1. Горват, А. Радзіва “Прудок”. Дзённік / Андрусь Горват. – Мінск: Медысонт, 2019. – 248 с.

## РОМАН В. ПЕЛЕВИНА «ОМОН РА» В КОНТЕКСТЕ РУССКОГО ЛИТЕРАТУРНОГО ПОСТМОДЕРНИЗМА

***Семашко Ю.В.,***
*магистрант ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Крикливец Е.В., канд. филол. наук, доцент

В постмодернизме привычные, классические формы и мотивы перестраиваются не в процессе естественного развития, а из-за превалирования концепции хаоса и распада. В произведениях авторов, работающих в этом течении можно заметить ассорти из различных эпох, культур, языков, фактов и вымыслов. Здесь современность граничит со временем Шекспира, эпохи Просвещения, романтизма и реализма. Все элементы не обладают самостоятельностью, они словно смешиваются, перетекают один в другой, передразнивают и пародируют друг друга. Читателю сложно определить, где заканчивается цитирование текстов других писателей и начинается собственное творчество автора.

Цель работы – проследить реализацию принципов постмодернистской эстетики в повести В. Пелевина «Омон Ра».

**Материал и методы.** Методологическую базу работы составляют труды отечественных и российских литературоведов, посвященные исследованию постмодернистской эстетики в литературе и в творчестве В. Пелевина в частности.

**Результаты и их обсуждение.** Постмодернизм в русской литературе – явление нелинейного характера, эклектичное с точки зрения эстетики, представляющее собой взаимодействие (а нередко – пародийную деконструкцию) различных художественных элементов: соцреализма, натурализма, авангарда, экзистенциальной прозы, карнавальных традиций и др. С точки зрения И.С. Скоропановой, в русской постмодернистской культуре формируется новая идеология, концепция человека, социума и культуры [3].

Названные особенности постмодернизма приводят к размыванию границ целостных эстетических явлений, к деконструкции жанровых форм, затрудняют само атрибутирование жанра, следовательно, требуют иных подходов к типологическому изучению проблемы жанрово-стилевой динамики.

В. Пелевин смог создать такое художественное пространство, где фантастическое органично соединяется с реальным, создавая искусственную, симулятивную конструкцию, на которой и держится мир. Привычные человеку законы морали здесь не работают: если ложь раскрыта, это не дает представление об истине, и наоборот, если продолжаешь лгать, правда от этого не уменьшается.

Писатель показывает своих героев в так называемой «плохой реальности», где нет укрытия от социальных потрясений. Знакомые реалии постсоветской действительности интерпретируются по-новому,